КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Жнівень

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ЖНІВЕНЬ

Віцебск 2013

З **5** па **26 жніўня** ў Талачынскім раённым Доме рамёстваў экспанавалася выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Фарбы роднай зямлі».

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

30 жніўня адкрылася выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога народнага мастацтва «Как прекрасен этот край» Талачынскага раённага Дома рамёстваў *(СДК аграгарадка Варанцэвічы)*.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

МАТЭРЫЯЛЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК

Настаўнік дзіцячай школы мастацтваў № 3 г. Барані *Кацярына Ігнацьева* і навучэнка фартэпіяннага аддзялення *Анастасія Калініна* ўзнагароджаны дыпломамі Усерасійскага семінара для выкладчыкаў і IV Усерасійскага фестывалю мультымедыйных праектаў навучэнцаў ДМШ і ДШМ «Музыка глазами детей», якія праходзілі ў маі ў Архангельску (Расійская Федэрацыя).

Аршанская газета. — 2013. — 17 жн. — С. 6.

Народны ансамбль народнай музыкі «Крынічанька» Палаца культуры г. Барані (кіраўнік В. Шпакоўскі) прыняў удзел у традыцыйным фальклорным свяце «Купалле», а таксама ў XV Міжнародным фальклорным фестывалі «Многоголосые песни диалектов-2013», якія праходзілі ў чэрвені ў літоўскіх гарадах Клайпеда і Ніда.

Аршанская газета. — 2013. — 17 жн. — С. 1.

мастак.

Витебский проспект. — 2013.— 15 авг. — С. 19.

Сёмая персальнальная выстаўка маладога мастака з Полацка *Івана Іванова* «Живопись» працавала ў **жніўні** ў Мастацкім музеі г. Віцебска. У экспазіцыі прадстаўлены 40 работ, створаныя за апошнія пяць гадоў.

Витебский проспект. — 2013.— 15 авг. — С. 19.

Адразу у дзвюх залах Цэнтра сучаснага мастацтва размясціліся работы віцебскага мастака *Уладзіміра Вітко*. Выстаўка «Юбилейная. 80» адкрылася **1 жніўня**.

Витебский проспект. — 2013.— 8 авг. — С. 19.

Мастацкі музей запрашае віцяблян і гасцей горада дакрануцца да «Художественного наследия Лазаря Рана». У экспазіцыі прадстаўлены работы, якія захоўваюцца ў фондах музея.

Витебский проспект. — 2013.— 8 авг. — С. 19.

МУЗЫКА

11 жніўня ў канцэртнай зале Сафійскага сабора адбыўся канцэрт арганнай музыкі *Нэлі Баравік*. **18 жніўня** перад аматарамі арганнай класікі выступіла салістка канцэртнай залы *Ксенія Пагарэлая*, а 25 жніўня адбыўся канцэрт камернай музыкі, у якім прынялі ўдзел *Ксенія Пагарэлая* (фартэпіяна) і *Вікторыя Бабенка* (скрыпка).

Полацкі веснік. — 2013. — 9 жн. — С. 15.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

Выстаўка эксперыментальнага тэкстылю «Метафары і метамарфозы» адкрылася ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо Віцебска “Дзвіна”». Тут сабрана больш за паўсотню работ майстроў мінскай і віцебскай школ тэкстылю, членаў Саюза мастакоў Беларусі розных пакаленняў. Віцебскую вобласць прадставілі *Наталля Лісоўская, Святлана Баранкоўская, Наталля Кімстач* і *Таццяна Козік*.

Витебские вести. — 2013.— 29 авг. — С. 24.

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Жнівень

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2013

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : жнівень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. — Віцебск, 2013. — 22 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2013

МАСТАЦТВА

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

30 карцін (пейзажы, нацюрморты) падарыў роднай Полаччыне ганаровы член Беларускага саюза мастакоў, ветэран Вялікай Айчыннай вайны *Віктар Казіміравіч Любавіцкі*. Выстаўка работ мастака адкрылася ў Палацы культуры г. Полацка.

Витебские вести. — 2013.— 15 авг. — С. 16.

У Мастацкім музеі абласнога цэнтра адкрылася выстаўка пад назвай «Славянское братство», на якой свае работы прадставілі мастакі з Беларусі, Расіі, Украіны і Сербіі.

Витебские вести. — 2013.— 10 авг. — С. 16.

1 жніўня ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі адкрылася выстаўка творчага аб'яднання «Содружество», на якой экспануюцца больш за 40 твораў мастакоў Беларусі, Расіі і Казахстана, якія расказваюць пра культуру, побыт і традыцыі розных народаў (партрэты, нацюрморты, пейзажы, батык, графіка, акварэль).

Аршанская газета. — 2013. — 17 жн. — С. 6.

«Натхненне» – так называецца новая выстава фотаздымкаў *Алеся Еслікава*, якая прадстаўлена ў Аршанскім музеі У. С. Караткевіча (пейзажы, партрэт).

Аршанская газета. — 2013. — 17 жн. — С. 6.

Армянскі мастак *Саак Антанесян* у **жніўні** прэзентаваў у Аршанскім музеі У. С. Караткевіча выстаўку работ «Настроение: 100 состояний души». Арганізатарамі паказу разам з аўтарамі выступілі адміністрацыя вобласці Лоры (Арменія) і мэрыя г. Спітак.

Аршанская газета. — 2013. — 10 жн. — С. 6.

У **жніўні** ў Мастацкім музеі была прадстаўлена персанальная выстаўка работ беларускага мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР *Пятра Дурчына* «Мне дорого это поколение…» (пейзажы), прымеркаваная да 90-гадовага юбілею Віцебскага мастацкага тэхнікума, вучнем якога быў

запаведніка з філіялаў Прыродна-экалагічны музей і Музей баявой славы. Усяго ў форуме прынялі ўдзел больш за 500 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама замежныя госці. Мерапрыемства прысвечана Году экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя, аб'яўленага ў 2013-м годзе ў СНД. Падчас форуму навуковыя супрацоўнікі прадставілі прэзентацыю, прысвечаную рабоце Прыродна-экалагічнага музея, экалагічныя гульні і рэкламную прадукцыю музеяў НПГКМЗ.

http://ecology.polotsk.museum.by/node/34209

«Кавалеры и дамы, судари и сударыни…» – выстаўка пад такой назвай адкрылася ў Наваполацкім гарадскім музеі гісторыі і культуры. Яе аўтар – *Наталля Палікарпава*, настаўніца з г. Верхнядзвінска, прадставіла на суд навапалачан больш за 30 лялечных персанажаў.

Новая газета (Наваполацк). — 2013.— 10 верас. — С. 8.

У Полацку на месцы памяці ахвяр фашызму ва ўрочышчы «Пяскі» ўсталяваны паклонны крыж (восенню 1941-га тут быў створаны транзітны лагер ваеннапалонных «Дулаг 125».)

Витебские вести. — 2013.— 3 авг. — С. 11.

У г. Верхнядзвінску пры садзейнічанні сямей са ЗША і Вялікабрытаніі ўстанавілі памятны знак на месцы масавага расстрэлу яўрэяў у гады вайны.

Витебские вести. — 2013.— 6 авг. — С. 2.

21 жніўня ў г. п. Бугушэўск на сцяне дома № 2 па вуліцы Дзяржынскага ўрачыста адкрыта інфармацыйна-памятная дошка ў гонар лётчыка *Аляксандра Эдуардавіча Марфіцкага*, які загінуў у 2009 годзе ў польскім г. Радаме падчас авіяшоу.

Витебские вести. — 2013.— 29 авг. — С. 10.

Калекцыя гарадскіх скульптур Віцебска папоўнілася помнікам сабаку. Ён з'явіўся ў **жніўні** побач з прахадной завода зборнага жалезабетона № 3 па вуліцы Гарбачэўскага.

Витебские вести. — 2013.— 29 авг. — С. 10.

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА…….4

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……..5

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 жніўня 2013 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя аддзелам культуры Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Браслаўскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Лепельскай, Лёзненскай, Полацкай, Сенненскай, Ушацкай і Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.

Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк

Музычны экскурс «Сердце помнит и поёт», прысвечаны 75-годдзю беларускага кампазітара І. Лучанка *(Вялікадолецкая сельская бібліятэка)*.

З **20** па **25 жніўня** Тыдзень экалогіі, у рамках якога адбылася бібліятэчная выстаўка «По страницам Красной книги», конкурс дзіцячых малюнкаў «Природа в моей жизни», відэагадзіна «Беловежская пуща», гадзіна цікавых паведамленняў «Знакомые незнакомцы», віктарына «Ласковый котенок и озорной щенок» *(Іллюшынская сельская бібліятэка)*.

28 жніўня Віртуальная вандроўка «По святым местам Беларуси» *(цэнтральная раённая бібліятэка імя Е. Лось)*.

Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк

17 жніўня Электронная прэзентацыя «История детской периодической печати» *(Обальская гарпасялковая бібліятэка)*.

24 ліпеня Віктарына «Любімыя кнігі нашага дзяцінства» для чытачоў малодшага школьнага ўзросту *(Светласельская сельская бібліятэка)*.

28 жніўня Сустрэча з псіхолагам цэнтральнай раённай бальніцы *І. А. Сальнікавай* «Пять шагов уверенности в себе» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

У жніўні Музей ткацтва прапаноўваў наступную праграму:

11 жніўня – вечарына беларускай народнай музыкі «Інструмент народны, і вясёлы, і журботны…»;

18 жніўня – майстар-клас «Лялькі з куфэрка бабкі Агапкі»;

25 жніўня – майстар-клас «Беларускі пояс – зручны і прыгожы».

Фінал XI Рэспубліканскага экалагічнага форуму праходзіў у горадзе Бабруйску **23–25 жніўня**. У ім прынялі ўдзел навуковыя супрацоўнікі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-

усяго прыпас» з удзелам фальклорнага калектыву «Голас спадчыны» *(Багатырская сельская бібліятэка сумесна з Багатырскім СДК)*.

18 жніўня Свята вёскі «Бацькаўшчына светлая мая» *(Лесаўская сельская бібліятэка-клуб)*.

20 жніўня Свята «Сонца і лета» ля помніка Сімяону Полацкаму *(дзіцячая бібліятэка імя Л. М. Талстога)*.

26 жніўня Дзіцячае свята «Праздник вежливости и доброты» *(Зялёнкаўская сельская бібліятэка з удзелам супрацоўнікаў СДК)*.

Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк

У **жніўні** працягвалася абслугоўванне ўдзельнікаў жніва на палявых станах, зернетаках. Праведзены інфармацыйныя гадзіны ў СВК «Сінягорскае», «Імя Данукалава», «Бяленева», «Пурплева».

Творчы вечар расійскага пісьменніка, члена Саюза пісьменнікаў Расіі, члена-карэспандэнта Пятроўскай Акадэміі навукі і мастацтва *Мікалая Траццякова (цэнтральная раённая бібліятэка).*

Літаратурная гульня «Путешествие в “Читай-город”» *(Нямойтаўская сельская бібліятэка).*

Бібліятэкары *Студзёнкаўскай, Пламенскай, Рулёўшчынскай* і *Беліцкай сельскіх бібліятэк* прынялі ўдзел у раённым свяце «Спас – усяго прыпас!». Бібліятэкарамі была арганізавана выстаўка кветак і дароў прыроды.

Завочнае падарожжа «Па краіне беларусаў» *(Цыпкаўская сельская бібліятэка)*.

Гутарка «Этикет для всех» *(Яноўская сельская бібліятэка)*.

Талачынская раённая сетка публічных бібліятэк

14 жніўня Кінавечар народнай кінастудыі «Летапіс» Талачынскага ГДК «Туризму все возрасты покорны» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Віцебскі абласны выканаўчы камітэт узнагародзіў Ганаровай граматай Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта:

Аленскую Ларысу Канстанцінаўну – намесніка начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта – начальніка аддзела культуры;

Багарада Леаніда Аркадзьевіча – намесніка генеральнага дырэктара па канцэртнай дзейнасці дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры “Віцебск”»;

Серабракову Алену Віктараўну – першага намесніка генеральнага дырэктара дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры “Віцебск”»;

Сідарэнку Аляксандра Пятровіча – генеральнага дырэктара дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры “Віцебск”» – за актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні XXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Витебские вести. — 2013.— 8 авг. — С. 9.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Член абласнога аддзялення СПБ *Муза Іванаўна Тарасевіч* узнагароджана граматай Урадавай камісіі Расійскай Федэрацыі па справах суайчыннікаў за шматгадовую працу на карысць расійскіх суайчыннікаў у Беларусі, плённую працу па захаванні рускай культурна-гістарычнай спадчыны, значны ўклад у развіццё сувязей з Расіяй.

Витебские вести. — 2013.— 3 авг. — С. 8.

У **жніўні** адбылася сустрэча афіцыйнай дэлегацыі г. Харбіна са

старшынёй Віцебскага гарвыканкама В. Нікалайкіным. Віцябляне азнаёмілі кітайцаў з інвестыцыйнымі праектамі па будаўніцтве гасцініц, зон адпачынку, забаўляльна-спартыўных аб'ектаў і запрасілі артыстаў Харбіна прыняць удзел з ў Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Витебские вести. — 2013.— 3 авг. — С. 2.

Дэлегацыя з Лепельскага раёна на чале з намеснікам старшыні райвыканкама М. Нікіціным наведала з візітам Мелекескі раён Ульянаўскай вобласці Расійскай Федэрацыі і прыняла ўдзел у акцыі «Россия и Беларусь – одна судьба – одна дорога». Вакальная група «Веселица»Поўсвіжскага сельскага Дома культуры пад кіраўніцтвам А. Міхно пазнаёміла жыхароў расійскай глыбінкі з традыцыямі беларускай культуры.

Витебские вести. — 2013.— 15 авг. — С. 4.

У **жніўні** ўдзельнікі ўзорнага харэаграфічнага калектыву «Веселушки» з г. Оршы вярнуліся г. Балчык, дзе праходзіў V міжнародны музычны танцавальны фестываль «Сонечная Балгарыя». Самыя юныя ўдзельнікі калектыву занялі першае месца ў малодшай узроставай групе, а артысты старэйшай узроставай групы заваявалі трэцяе месца. Акрамя аршанскіх артыстаў нашу краіну прадстаўлялі і ўдзельнікі творчага калектыву «Затея» з г. Лепеля.

http://www.orshanka.by/?p=21691#more-21691

Узорны дзіцячы тэатр моды «Топ-топ» Дома культуры і дасуга г. Наваполацка вярнуўся ў **жніўні** з Балгарыі з узнагародамі міжнароднага творчага фестывалю «Волна идей-2013». Калектыў заняў другое каманднае месца і стаў уладальнікам спецыяльнага прызу фестывалю «Серебряная волна».

Новая газета (Наваполацк). — 2013.— 30 жн. — С. 16.

28 жніўня Інфармацыйная гадзіна «Великолепная семёрка: лечебные свойства овощей» з удзелам правізара *Л. У. Занько (цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк

19 жніўня Прагулка па літаратурным садзе «Яблоневый Спас» у рамках праекта «Библиотека вне стен» *(цэнтральная раённая і дзіцячая бібліятэкі)*.

24 жніўня Кніжная выстаўка «Браты нашы меншыя» на раённым свяце «До свидания, лето! Здравствуй, школа!» *(цэнтральная раённая і дзіцячая бібліятэкі)*.

Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк

17 жніўня Урок беражлівасці «Не дайте капельке упасть» для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту *(Ляхаўшчынская сельская бібліятэка)*.

15 жніўня Конкурсная праграма «И цветы нам нежно улыбались» *(Лынтупская гарпасялковая бібліятэка)*.

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

9 жніўня Літаратурная кампазіцыя «Чтобы экономней жить» *(Грамашчанская сельская бібліятэка-клуб)*.

10 жніўня Спартыўнае свята «Будь здоров и побеждай», падрыхтаванае сумесна з супрацоўнікамі Руднянскага СДК *(Руднянская сельская бібліятэка-філіял)*.

12 жніўня Майстар-клас «Малюем манкай» *(цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны)*.

11 жніўня Свята вёскі Чарнаручча «Я люблю этот край» з удзелам фальклорнага калектыву «Родныя напевы» *(Шпакоўшчынская сельская бібліятэка-клуб)*.

18 жніўня Свята «Красуйся вёсачка мая, бо сёння Спас, які нам

Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк

10 жніўня Віртуальнае гістарычнае падарожжа «Зямля, дзе пачаўся твой лёс» *(Акцябрская сельская бібліятэка)*.

19 жніўня Фальклорнае тэатралізаванае свята «Другі Спас яблычка прыпас» *(Мазалаўская сельская бібліятэка)***.**

22 жніўня Семінар-трэнінг для бібліятэчных работнікаў сістэмы «Усе разам супраць СНІДу» *(цэнтральная раённая бібліятэка).*

31 жніўня Літаратурны вечар, прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння Я. Маўра «Першапраходзец далёкіх і блізкіх зямель» *(Ноўкінская сельская бібліятэка)*.

Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк

6 жніўня Свята вёсак Канавалава і Маісеева «Мое село, моя глубинка» *(Халамерская сельская бібліятэка сумесна з мясцовым сельскім клубам)*.

23 жніўня Семінар бібліятэкараў раёна «Роль библиотеки в продвижении села как историко-культурного и эколого-досугового объекта» на базе *Віраўлянскай сельскай бібліятэкі.*

Докшыцкая раённая сетка публічных бібліятэк

28 жніўня Літаратурна-музычнае рандэву «Сэрца памятае і ıявае», прысвечанае 75-годдзю з дня нараджэння беларускага кампазітара Лучанка *(Таргуноўская сельская бібліятэка і ДК)*.

29 жніўня Падведзены вынікі акцыі «Лета кніжнае, будзь са ной» *(дзіцячая раённая бібліятэка)*.

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу абноўлена база даных «Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць». Супрацоўнікі аддзела вялі збор матэрыялаў для афармлення фотавыстаўкі да свята «Падарожжа па вёсцы Пышна».

АГРАЭКАТУРЫЗМ

У рамках праекта «Содействие развитию туризма в приграничных рагионах Латгалии, Утяны и Витебска» (BELLA DVINA-2), праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвіі – Літвы – Беларусі ў рамках Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства, у Латвіі (г. Ліваны) адбыўся фестываль актыўнага турызму-2013, у якім прынялі ўдзел 7 каманд. Нашу краіну прадстаўляла каманда Полацкага раёна, якая заняла першае агульнакаманднае месца.

Полацкі веснік. — 2013. — 23 жн.— С. 2.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

У рамках святкавання 1025-годдзя Крышчэння Русі ў Мінску адбыўся канцэрт лепшых творчых калектываў краіны. У іх ліку быў народны камерны хор Глыбоцкага Дома культуры пад кіраўніцтвам *Д. Волкавай* і вакальны квартэт музычнай школы з г. п. Ушачы.

Веснік Глыбоччыны. — 2013. — 7 жн. — С. 1.

На працягу месяца клубнымі ўстановамі Міёрскага раёна праведзены святы вёсак Дарожкі «Вёсачка мая!», Папшулі, Сіцькова, Туркова «На зямлі Туркоўскай». Свята вескі Паташня Міёрскага раёна адбылося ў пачатку **жніўня**. Падчас мерапрыемства былі падведзены вынікі агляду па добраўпарадкаванні сельскіх сядзіб, прайшло тэатралізаванае прадстаўленне «Прыгоды Паўлінкі на кірмашы», канцэрт мастацкага калектыву пад кіраўніцтвам *Ю. Сычова* з Глыбоцкага культурна-спартыўнага цэнтра. Гучалі песні ў групавым, дуэтным і сольным выкананні.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

На працягу **жніўня** работнікамі клубных устаноў Талачынскага раёна былі падрыхтаваны і праведзены наступныя мерапрыемствы:

1 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Варанцэвіцкага СДК праведзены канцэрт «Шчыра дзякуем за працу»
поле в. Башарова
поле в. Абольцы

4 жніўня загадчыкам Славенскага СК праведзена свята вёскі «Зямля мая родная»
в. Нарцызава

4 жніўня творчымі работнікамі Аболецкага ДФ праведзена свята вёскі
«Вёсачка мая, вёска родная»
в. Мікуліна

4 жніўня загадчыкам Усвіж-Букскага ПДК праведзена свята пасёлка «У зямлі маёй карані»
п. Усвіж-Бук

6 жніўня загадчыкам Усвіж-Букскага ПДК праведзена свята вёскі «Вёсачка мая»
в. Н. Саколіна

8 жніўня вечар адпачынку «Молодость в пути»
Навінкаўскі КБ

9 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Друцкага СК праведзены канцэрт «Калинка»
мехдвор «Друцк-Агра»

9 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Талачынскага ГДК праведзены канцэрт «Да будет щедрым урожай»
поле в. Друцк

11 жніўня віктарына «Беларуская скарбонка»
Высокагарадзецкі СК

11 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Валосаўскага СК праведзены канцэрт-віншаванне «Мой родны кут»
ферма в. Валосава

11 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Аболецкага ДФ праведзена свята «Што пасееш, то пажнеш»
поле в. Чачанева

14 жніўня гульнёвая праграма «Спас – усяму час»
Высокагарадзецкі СК

жывёл «Вучыцца любві і адданасці» *(цэнтральная гарадская дзіцячая бібліятэка імя А. Гайдара)*.

Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

1 жніўня Дзень памяці салдат, якія загінулі ў мірны час «В сердцах наших вечно живые». У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі камітэта салдацкіх маці, гарадской арганізацыі Беларускага саюза жанчын, Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, святочны канцэрт падрыхтавалі ўдзельнікі народнага літаратурна-музычнага аб'яднання «Крылы» *(бібліятэка імя К. Сіманава)*.

13 жніўня Флэшмоб «С книгой по городу» *(бібліятэка імя У. Караткевіча)*.

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

20 жніўня Нарада бібліятэчных работнікаў «Дзень прафесійных зносін», у рамках якой адбыліся наступныя мерапрыемствы: гадзіна здароўя «Здаровая асоба – здаровае грамадства» (сустрэча з урачом-стаматолагам ЦРБ), прагляд мерапрыемства Друйскай бібліятэкі-філіяла гадзіна беларусазнаўства «Сем цудаў Беларусі», дзелавая гульня «Вырашаем прафесійныя пытанні разам», хвіліна ўзаемаінфармацыі «Мае творчыя знаходкі» інш. *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

9 жніўня Літаратурна-музычная вечарына па творчасці Г. Ахматавай і М. Цвятаевай «Одну с тобой мы землю топчем» *(Друеўская сельская бібліятэка)*.

Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк

27 жніўня Мульцімедыйная прэзентацыя «Наш родны край прыгожы самы»*(Асвейская гарпасялковая бібліятэка)*.

31 жніўня Свята вёскі Барсукі «Вёсачка мая» *(Жыгулёўская сельская бібліятэка-клуб)*.

(Бігосаўскі СДК), *У Слабадзенюк* і *Л. Андрэева* (Бігосаўскі СДК). Дыпломамі першай ступені адзначаны *В Сіняўская* (Сар'янскі СДК) і вакальны гурт «Гукі сэрца» (Антонаўскі СДК). Дыпломы за высокае прафесійнае майстэрства атрымалі *Т Літвінава* (Запруддзеўскі СДК) і вядучая свята *А. Рымкевіч* (Валынецкі СДК). За ўдзел у фестывалі дыпломамі адзначаны *Вольга і Леанід Заваротныя* (г. п. Расоны), *Т. Сцяпанава* (г. Масква), народны вакальны гурт «Дзвінскія напевы» (Бігосаўскі СДК), вакальны гурт «Сузор'е» (г. Вісагінас), Верхнядзвінскі Дом рамёстваў, Сар'янскі сельскі Дом культуры. Дыпломамі адзначаны экспанаты, якія падрыхтавалі для выстаўкі «У кожным букеце – песня» Запруддзеўскі, Дзёрнавіцкі, Валынецкі, Антонаўскі сельскія Дамы культуры і Ігналінскі клуб-бібліятэка.

http://www.d-p.by/2013/08/u-verxnyadzvinskim-rayone-adbylosya-svyata

Витебские вести. — 2013.— 15 авг. — С. 16.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

3 жніўня Электронная выстаўка «Патрыярх сучаснай музычнай культуры» да 100-годдзя з дня нараджэння народнага артыста Беларусі А. Багатырова.

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

Выстаўка выцінанкі «Поры года» чытачкі *Ірыны Кавалеўскай (бібліятэка імя Е. Лось)*.

5 жніўня Сустрэча чытачоў *бібліятэкі імя Еўфрасінні Полацкай* з удзельнікамі праваслаўнага фестывалю «Адзігітрыя». У мерапрыемстве прымалі ўдзел трыа «Яблынька» з г. Балашыха (Расійская Федэрацыя) і айцец *Сергій* з г. Самары (Расійская Федэрацыя), выступілі паэтэса *Н. Салаўёва*, бард *П. Захараў*, трыа «Каўчэг».

15 жніўня Урок міласэрнасці да Міжнароднага дня бяздомных

14 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Слаўнаўскага СДК праведзены канцэрт «Мы славим ваши руки»
ферма в. Аўхуты

14 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Талачынскага ГДК праведзены канцэрт «Вашей работой гордится район»
поле в. Кацэвічы

15 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Коханаўскага ГПДК праведзены выязны канцэрт «Песня работать и жить помогает»
в. Заазер'е

16 жніўня творчымі работнікамі Коханаўскага ГПДК праведзена свята вёскі «Святая как хлеб деревенька моя»
в. Шапчына

20 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Жукнеўскага СК праведзены канцэрт «Віншаванні камбайнёраў»
мех. двор в. Жукнева

23 жніўня загадчыкам Навасельскага СК праведзена свята вёскі «Песні роднага краю»
в. Мяшкова

25 жніўня творчымі работнікамі Варанцэвіцкага СДК праведзена свята вёскі «Дороже места нет на всей земле»
в. Любанічы

28 жніўня лекцыя «Наркотики – бессмысленная трата времени»
Друцкі СК

28 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Варанцэвіцкага СДК праведзены абрад «Дажынкі»
поле в. Башарова

28 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Талачынскага ГДК праведзены канцэрт «Счастливого пути»
мяжа Талачынскага раёна
аўтамагістраль Е 95 594 км

30 жніўня Свята вёскі Старынкі Талачынскага раёна «Вёсачка мая»

(Рамашкаўскі КБ)

31 жніўня калектывамі аматарскай творчасці Аболецкага ДФ праведзены канцэрт «Песні і праца заўсёды разам» поле в. Мурагова.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

17–18 жніўня ў в. Вароны Докшыцкага раёна прайшло свята печы. Арганізавалі яго работнікі Крыпульскага і Бярозкаўскага сельскіх дамоў культуры. Гучалі песні, былі прадстаўлены танцы і гульні з вакарыстаннем тэматычнай атрыбутыкі.

Витебские вести. — 2013.— 24 авг. — С. 16.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

З **31 ліпеня** па **4 жніўня** на базе праваслаўнага маладзёжнага лагера «Дружба» (каля вёскі Вароны) праходзіў традыцыйны маладзёжны фестываль «Адзігітрыя-2013», у яім прынялі ўдзел каля 300 маладых людзей з Беларусі, Украіны і Расіі. **1** і **3 жніўня** ўдзельнікі форума далі канцэрт ля сцен Успенскага сабора і ў Летнім амфітэатры. Таксама ў праграме мерапрыемства інтэрактыўныя гульні, майстар-класы па харэаграфіі, вогненнае шоу і інш. Па завяршэнні творчай часткі фестывалю з **5** па **10 жніўня** адбыўся крэсны ход ў Смаленск у гонар іконы Божай Маці «Адзігітрыя».

Витебский проспект. – 2013. – 25 июля. – С. 2.

16 жніўня ў аграгарадку Арэхаўна Ушацкага раёна адбыўся **«Праздник колодцев»**. Яго арганізатары – аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама, Арэхаўскі СДК і жыхары аграгарадка ўспомнілі традыцыі і павер'і, асвяцілі ваду, уручылі лепшым гаспадарам калодзежаў караваі, падарылі песні і добры настрой.

Витебские вести. — 2013.— 20 авг. — С. 1.

17 жніўня ў в. Алашкі Шаркаўшчынскага раёна прайшоў **фестываль «Светлый яблочный Спас – сикоровской души частичка»**. Каля гібрыднага саду была ўстаноўлена скульптура «Памяти Сикоры». Падчас свята адбылася выстаўка страў нацыянальнай азербайджанскай, беларускай і стараверскай кухні.

Витебские вести. — 2013.— 20 авг. — С. 25.

17 жніўня ў аграгарадку Празарокі Глыбоцкага раёна адбылося **свята «У госці да дзядзькі Ігната»**. Удзел у мерапрыемстве прынялі аматары танцаў часоў заснавальніка першага беларускага тэатра – І. Буйніцкага. Працавалі гандлёвыя кропкі, карчма, Горад майстроў, кірмаш рамёстваў, гульнёвыя пляцоўкі, у фае сельскага клуба была прадстаўлена «Гісторыя батлейкі». Кульмінацыяй свята стала праграма народных танцаў «Каля музычнага воза», этнадыскатэка і фінальны танец «Юрачка».

Витебские вести. — 2013.— 15 авг. — С. 24.

17 жніўня ў Падсвіллі прайшло дзявятае па ліку свята гарпасёлка, арганізатарам якога з'яўляецца Падсвільскі гарпасялковы выканаўчы камітэт. Творчую праграму **«Падсвільскіх світанкаў»** падрыхтавалі супрацоўнікі мясцовага Дома культуры. Падчас мерапрыемства былі ўзнагароджаны лепшыя працаўнікі краю, пераможцы розных спаборніцтваў і конкурсаў. Знаёмства з творчымі цікавымі людзьмі гарпасёлка працягнулася ў час паказу тэатралізаванага прадстаўлення «Падсвільская скарбонка», канцэртнай праграмы «Песні 60-х» і эстрадна-танцавальнай – «Падсвільскі хіт-парад»

Веснік Глыбоччыны. — 2013. — 24 жн.— С. 1—2.

Фестываль народнай творчасці «Збіраем зорны карагод» ў шосты раз адбыўся ў аграгарадку Валынцы Верхнядзвінскага раёна **25 жніўня**. У фестывалі прынялі ўдзел творчыя аматарскія калектывы клубных устаноў раёна: «Гукі сэрца» (Антонаўскі СДК) і «Дзвінскія напевы» (Бігосаўскага СДК). У ліку гасцей – калектыў беларускай народнай песні Вісагінскага цэнтра культуры з Літвы. У праграме свята: конкурс «Рэтра шлягер», выстаўка кветак «У кожным букеце песня» народных умельцаў і майстроў Дома рамёстваў «Скарбонка Верхнядзвіншчыны». Лаўрэатамі трэцяй ступені конкурсу «Рэтра шлягер» сталі *Т. Аўчыннікава* (Сакалоўшчынскі сельскі клуб), *А. Зяцькоў* (Запруддзеўскі СДК), вакальны гурт «Сузор'е» (г. Вісагінас) і *П. Юхновіч*. Дыпломы лаўрэатаў другой ступені атрымалі вакальны гурт «Світанак»